**Пасхальнае пасланне**
**Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі КІРЫЛА**
**архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам**
**і ўсім верным дзецям Рускай Праваслаўнай Царквы**

**Узлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, пачэсныя прасвітары і дыяканы, богалюбівыя інакі і інакіні, дарагія браты і сёстры!**

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

Гэтымі жыццесцвярджальнымі і напоўненымі найвялікшай духоўнай сілы словамі сардэчна вітаю ўсіх вас і віншую з вялікім і светланосным Святам Пасхі.

Царкоўная традыцыя невыпадкова называе гэты дзень *святам святаў і ўрачыстасцю з урачыстасцяў*, бо Уваскрасенне Хрыстова – моцная аснова нашай веры і надзеі. У імператварэнне і абнаўленне кожнага чалавека, святло вечнага жыцця і крыніца непераходзячай радасці. Уваскрасенне Хрыстова знішчыла самых страшных ворагаў роду чалавечага – грэх і смерць, разбурыла перашкоду паміж Богам і людзьмі і пазбавіла нас ад улады зла.

Праслаўляючы Уваскрасенне Спасіцеля, свяціцель Мікалай Сербскі пісаў, што «*перамога Хрыстова ёсць адзіная перамога, якой могуць радавацца ўсе чалавечыя істоты, ад першароднай і да апошняй. Усякая іншая перамога на зямлі раздзяляла і раздзяляе людзей ... Але толькі Хрыстова перамога – як сонца, якое вылівае светлыя прамені на ўсіх тых, хто стаіць пад ім*» (Гутаркі. Евангелле пра Пераможцу смерці).

Гэта азначае, што кожнаму чалавеку, які імкнецца да спасення, хто верує і ідзе ўслед за Хрыстом, даравана магчымасць атрымаць перамогу над грахом і стаць, паводле слова апостала і евангеліста Іаана, узлюбленым *дзіцём Божым* (1 Ін. 3, 1).

Мы святкуем Пасху, не як пераход з адной зямлі ў другую, няхай і Запаветную, як святкавалі старажытныя яўрэі сваю старазапаветную пасху, радуючыся вызваленню са шматгадовага егіпецкага палону. Наша Пасха пра іншае. Гасподзь вызваліў нас *ад цемры і ценю смерці* (Лк. 1, 79) і дараваў нам Нябеснае Царства.

«*На святло свабоды вывеў Хрыстос маркотных нявольнікаў – да вышыняў горных Раю ўзвёў Ён іх, лікуючы*» (гімн XXXVIII), – гэтыя натхнёныя радкі прападобнага Яфрэма Сірына выказваюць глыбокае перажыванне пасхальнай таямніцы – таямніцы выратавання чалавека ад уздзеяння на яго

зла. Зло не знікла, але чалавек атрамаў магчымасць сілай благадаці Божай змагацца са злом і перамагаць яго праз пакаянне, малітву і далучэнне да Цела і Крыві Спасіцеля ў Таінстве Святой Еўхарыстыі. Таму разам з апосталам Паўлам мы сцвярджаем, што *Той, Хто ўваскрасіў Хрыста з мёртвых, ажывіць і вашы смяротныя целы Духам Сваім, Які жыве у вас* (Рым. 8, 11).

Пасха Хрыстова азначае пераход ад зямнога тлення да вечнага жыцця з Богам, да адзінства з нашым Тварцом і Адкупіцелем. А таму, радуючыся аб Уваскрэслым дзеля нас Іісусе і *з удзячнасцю прымаючы Чашу спасення* (Пс. 115, 4), у якой Царква дае нам сапраўдную Ежу і Пітво бессмяротнасці – Цела і Кроў Хрыстовы, будзем нястомна і нязмоўкла праслаўляць Госпада справамі любові і міласэрнасці, выяўляючы сябе Яго вернымі вучнямі.

І хоць наша імкненне да дабра і поспех у справе Божай можа часам здавацца сціплай *лептай ўдавы* (Мк. 12, 42), будзем заўсёды мець клопат, каб не слабела ў нас цвёрдасць веры і непахіснасць надзеі, *ведаючы, што праца ваша не марная перад Госпадам* (1 Кар. 15, 58).

Узнясем жа Уваскрэсламу Спасіцелю хвалу і славу, абдымем адзін аднаго з любоўю і падзелімся незгасальнай пасхальнай радасцю з кожным чалавекам, з якім звядзе нас Бог на нашым жыццёвым шляху, словам і справай засведчым, што

САПРАЎДЫ УВАСКРЭС ХРЫСТОС!

**ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЯЕ РУСІ**

*Пасха Хрыстова*
*2025 г.*